*Алег Аляхновіч*

**АПРАЦОЎКІ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ ЯК ТЫП ФАЛЬКЛАРЫЗМУ**

Выкарыстанне фальклору ў іншых галінах культуры і мастацтва атрымала ў навуцы тэрмін «фальклярызм» [3, с. 406]. Апрацоўкі народных песень найбольш выкарыстоўваюцца ў прафесійнай і аматарскай творчасці і трывала ўвайшлі ў выканальніцкую практыку. Не выклікае сумненняў, што асоба аўтара апрацоўкі, веданне ім фальклорных традыцый і беражлівыя адносіны да іх маюць рашаючае значэнне. Таленавіты аўтар распрацоўвае ў песнях меладычныя інтанацыі, уласцівыя прыродзе канкрэтных жанраў. Напрыклад, у веснавой песні «Жавароначкі, прыляціце» або купальскай «Ой, рана на Йвана» ў апрацоўцы Г.І. Цітовіча творча ўвасабляюцца характэрныя прыметы веснавой і купальскай песні. Роля суб'ектыўнага фактару ў гэтым відзе творчасці ўзрастае. Крытэрыем многіх апрацовак некаторыя вучоныя лічаць таленавітасць, мастацкую яркасць і пераканаўчасць. У некаторых апрацоўках значныя змены церпіць перш за ўсё меладычны матэрыял. У гэтым выпадку крытэрыямі фальклорнасці становяцца прафесіянальныя рысы: майстэрства апрацоўкі і ўзровень мастацкага выканання твораў. Звычайна выканаўцамі апрацовак з'яўляюцца людзі рознага ўзросту, сацыяльнага становішча, адукацыі. Многія з іх не абмяжоўваюцца якой-небудзь адной манерай спеваў, а спрабуюць авалодаць рознымі музычнымі стылямі.

Трэба адзначыць, што не ўсе кіраўнікі фальклорных калектываў, практыкі традыцыйных спеваў, хто мае дачыненне да апрацовак, усведамляюць, што выкананне народнай песні з раздзяленнем галасоў на сапрана, альты, тэнары і басы - гэта агульнаеўрапейская альбо руская манеры выканання. Аўтар ні ў якім выпадку не супраць класічных спеваў, але ў народзе так ніколі не спявалі і не спяваюць, хаця вытокамі акадэмічных спеваў з'яўляюцца народныя песенныя традыцыі. Арыентацыя на прафесійныя ўзоры харавых спеваў, дрэннае веданне народнай манеры выканання, нежаданне некаторых кіраўнікоў і ўдзельнікаў калектываў (асабліва народных хароў) вучыцца, зрабілі, па сутнасці, гэтыя калектывы псеўдароднымі. Іншыя зусім не задумваюцца над творчай інтэрпрэтацыяй народнай песні, пачынаюць яе «ўдасканальваць», «аздабляць». А потым высвятляецца, што гэта песня абрадавая і апрацоўкай яе проста сапсавалі.

Сутнасць апрацоўкі павінна вызначацца беражлівымі адносінамі да арыгінала, імкненнем захаваць стылявыя асаблівасці фальклорнага твора, падкрэсліць самабытнасць фальклорнай песні. У беларускім песенным фальклоры шмат песень, зручных для сцэнічнага ўвасаблення. Але трэба мець на ўвазе, што не кожная народная песня можа быць апрацавана. Кампазітар А.Н.Сяроў пісаў: «Вельмі многа з'явіцца выпадкаў, дзе песня будзе абавязкова сапсавана, калі да яе адзінкавай унісоннай мелодыі будзе дададзена хоць адна нотка» [4, с. 55].

Прынцыпы, якія вызначаюць меру творчай апрацоўкі народнай песні, характарызуюцца ў асноўным двума фактарамі: улікам прыроды самой песні і творчым напрмкам, якога прытрымліваецца аўтар. Выкананы выдатным знаўцам фальклору Г.І Цітовічам, апрацоўкі народных песень - узор беражлівых адносін да фальклорнай традыцыі і высокага ўзроўню прафесіянальнага майстэрства. Параўноўваючы сваю апрацоўку народнай песні «Жавароначкі, прыляціце» з апрацоўкай гэтага ж твора кампазітарам Л. Шлег Г.І. Цітовіч казаў: «Я зрабіў інакш і пры гэтым не парушыў асноўную меладычную лінію напеву. У іншых апрацоўках, калі я дзе і парушаў яе, то першы куплет заўсёды даваў у арыгыінале. Часта ж кампазітары дазваляюць сабе і празмерныя вольнасці, а часам здараецца так, што і «паху» народнай песні не застаецца» [1, с. 62].

Апрацоўка народнай песні адрозніваецца ад распрацоўкі. Апрацоўка - гэта захаванне арыгінала, яна заўсёды павінна быць пазнавальнай у сваёй аснове. У апрацоўкі неабходна прыўносіць элементы прафесіяналізму, выконваць іх, не скажаючы песенных традыцый. Некаторыя апрацоўкі зводзяць да простай гарманізацыі мелодыі па «вертыкалі», што не з'яўляецца эталонам дасканальнасці. Распрацоўка ж песні носіць суб'ектыўны характар. Тут аўтар распрацоўвае тыя ці іншыя элементы фальклорнага матэрыялу, асэнсоўвае іх вобразны змест, прапускае іх скрозь прызму ўласных творчых прынцыпаў. Гэтыя два напрамкі ў рабоце над песняй часта знаходзяцца побач, дапаўняючы адзін аднаго.

Найбольш распаўсюджанай формай выкарыстання народнай музыкі ў практыцы з'яўляюцца апрацоўкі фальклорных твораў, пры якіх у рознай ступені захоўваецца фальклорная першакрыніца. Да асноўных прыёмаў апрацоўкі трэбы аднесці ўзмацненне сродкаў выразнасці, павелічэнне дынамікі гучання, распрацоўка пэўнай рэжысуры выканання, узбагачэнне гармоніі, аранжыроўкі, транспаніравання, дапаўненне асноўнай мелодыі новымі тэмамі, інтанацыямі і інш.

Шырокую вядомасць атрымалі апрацоўкі народных песень у 1920-30-х г.г. кампазітараў К.Галкоўскага, А.Кошыца, М.Гайваронскага, М.Аладава, А.Аленіна, А.Грачанінава, М.Іпалітава-Іванава, А.Прохарава, А.Залатарова, А.Багатырова, Р.Пукста, Я.Цікоцкага, І.Любана, ГІ.Падкавырава, Н.Сакалоўскага, М.Чуркіна і інш. Гэтыя кампазітары выкарыстоўвалі ў творчасці разнастайныя прыёмы і формы апрацовак фальклорных першакрыніц, імкнуліся захаваць іх першаснову.

Новы этап у развіцці апрацовак народнага меласу звязаны з творчай дзейнасцю Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Рэспублікі Беларусь імя Р. Шырмы і Дзяржаўнага Акадэмічнага народнага хору імя Г.Цітовіча Рэспублікі Беларусь. Лепшыя з іх раскрываюць бясконцае багацце музычнага развіцця, закладзенае ў народнай песні. Пленна працуюць у галіне апрацовак у апошнія дзесяцігоддзі М.Сірата, Л.Захлеўны, Э. Наско, А.Рашчынскі, В.Сярых, Ул. Зяневіч, Г.Несцяровіч і інш.

На наш погляд, апрацоўкі народных песень з'яўляюцца адным з тыпаў фальклярызму ў мастацкай творчасці песенных, песенна-інструментальных, харэаграфічных фальклорных калектываў, ансамбляў, народных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хароў, асобных выканаўцаў, якія выконваюць музычны фальклор у апрацаваным выглядзе. Гэтыя выканаўцы - людзі рознага ўзросту, адукацыі і культуры, як правіла, не з'яўляюцца носьбітамі традыцый. Важна, каб апрацоўкі фальклору адлюстроўвалі канкрэтны фальклорны стыль. Трэба адзначыць, што многія сучасныя хары, асабліва гарадскія, выконваюць апрацоўкі музычнай спадчыны без арыентацыі на *канкрэтны* мясцовы стыль і з'яўляюцца, па сутнасці, псеўданародным

Разглядаючы апрацоўкі народных песень як *тып фалькларызму* неабходна, на жаль, канстатаваць, што некаторыя тэарэтыкі і практыкі фальклору памылкова лічаць, што яны ўвасабляюць у творчай дзейнасці «аўтэнтычны» фальклор. Апошні, як вядома, існуе толькі ў жывым бытаванні і захоўваецца пераважна ў памяці носьбітаў традыцый. Перанос яго ў іншыя ўмовы заўсёды непазбежна звязаны са стратай натуральнасці, аўтэнтыкі. Нават таленавітая апрацоўка ніколі не будзе арыгіналам, а толькі яго копіяй. Гэта не азначае, што апрацоўка, як і іншыя тыпы фалькларызму (другасны фальклор, стылізаваны, рэстаўрыраваны, рэканструяваны і інш.) нешта нявартае нашай увагі. Наадварот, у сучасным жыцці фалькларызм адзіная альтэрнатыва зберажэння і выкарстання фальклору ў другасных формах. Можна заўважыць, што многія тыпы фалькларызму, у тым ліку апрацоўкі, тарпляюць зноў у народнае асяроддзе і прадаўжаюць існаваць у новых сацыяльных умовах. Настала пара вярнуць народу яго фальклорную спадчыну і адрадзіць яе на новым узроўні культурнага жыцця грамадства.

Мяркуем, што слоўная прыстаўка «этна» - для вызначэння заняткаў фальклорам у навучальным працэсе і мастацкай творчаці, не мае тэарэтычнага абгрунтавання для свайго ўжывання. У навуковай літаратуры слова «этна» выкарыстоўваецца для фіксацыі творчай дзейнасці народа ў *натуральных* умовах. Узнаўленне фальклору ў навучальным працэсе і творчай дзейнасці - гэта тыповы прыклад фалькларызму (г.зн. другасных форм) у розных галінах адукацыі і культуры.

Такім чынам, у сучасных умовах апрацоўкі народных песень з'яўляюцца найбольш распаўсюджаным тыпам фалькларызму, важным здабыткам духоўнай культуры народа.

**Спіс літаратуры:**

1. Аляхновіч, А.М. Народная песня ў школе / А.М. Аляхновіч. - Мінск : Беларусь, 2004. - 171 с.
2. Аляхновіч, А.М. Беларуская традыцыйная музычная спадчына / А.М. Аляхновіч. - Мінск : Беларусь, 2000. - 384 с.
3. Гусев, В.Е. Фольклоризм / В.Е. Гусев // Восточно-славянский фольклор. Словарь научной и народной терминологии. - Минск : Навука і тэхніка, 1993. - С. 406-407.
4. Серов, А.Н. Русская народная песня как предмет науки / А.Н. Серов. - М.: Наука, 1952. - С. 55.
5. Шырма, Р.Р. Музычная апрацоўка беларускіх мелодый // Р.Р. Шырма // Песня - душа народа. - М., 1976. - 345 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ